# "Чарнобыль" адступае…

Сёлета істотна павялічваецца фінансаванне «чарнобыльскай» праграмы.

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае намеснік начальніка дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Мікалай ЦЫБУЛЬКА.

— Пасля чарнобыльскай трагедыі мінула ўжо 27 гадоў. Як за гэты час змянілася радыяцыйнае становішча ў нашай краіне? Можа, радыяцыя крыху адступае?

— За постчарнобыльскі перыяд у выніку натуральнага распаду радыенуклідаў цэзію і стронцыю плошчы забруджаных тэрыторый сапраўды скараціліся. Плошча зямель, забруджаных цэзіем-137, скарацілася з 46,5 тысячы квадратных кіламетраў (кв. км) да 30,1 тыс. кв. км, а тэрыторыя са стромцыем-90 зменшылася з 21 тысячы да 11,8 тыс. кв. км. У сувязі са змяншэннем плошчы такіх зямель за пасляаварыйны час колькасць населеных пунктаў у зоне радыяцыйнага забруджвання зменшылася з 3600 да 2402, ці на 33 працэнты. Зразумела, што і людзей на такіх не зусім чыстых тэрыторыях цялер стала жыць істотна менш Колькасць насельніцтва на забруджаных тэрыторыях скарацілася з 2,2 млн да 1 млн 141 тысячы чалавек, або ў 1,9 раза.

— Дзяржава і зараз працягвае дапамагаць гэтым людзям дастойна жыць у такіх няпростых умовах?

— У межах Дзяржаўнай праграмы па пераадольванні наступстваў катастрофы на ЧАЭС на 2011—2015 гады і на перыяд да 2020 года ажыццяўляецца сістэма ахоўных мерапрыемстваў у сферы вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і па лініі лясной гаспадаркі.

Зараз асноўная дозавая нагрузка на насельніцтва фарміруецца за кошт унутранага апраменьвання людзей праз спажыванне прадуктаў харчавання. Таму сёння галоўны ўхіл робіцца на правядзенне мерапрыемстваў, што звязаны з атрыманнем нарматыўна чыстай прадукцыі, а таксама з удасканальваннем радыяцыйнага кантролю такой прадукцыі.

Тут асобна адзначу, што за апошнія 10 гадоў у гэтым рэгіёне ўся атрыманая прадукцыя адпавядае нарматывам па колькасці радыенуклідаў цэзію і строкцыю. Было толькі некалькі адзіночных выпадкаў, аднак дзейная сістэма радыяцыйнага кантролю дазваляе весці маніторынг службы харчавання такім чынам, каб ні аднаго кілаграма сумніўнага мяса ці літра малака не патрапіла ў гандлёвую сетку.

— Пасля катастрофы ў Беларусі застапіся тарыторыі, дзе людзі ўвогуле не жывуць...

— На такіх тэрыторыях выконваецца комплекс мерапрыемстваў па ахове ад несанкцыянаванага пранікнення туды грамадзян і незаконнага выкарыстання зямель.

Разам з тым, адзначу, што за мінулыя гады плошча зон адсялення і адчужэння была зменшана на 15,6 працэнта—да 266,1 тыс. га (у Гомельскай вобласці — 164,4 тыс. га, у Магілёўскай —101,7 тыс. га).

Там своечасова выконваюцца работы па добраўпарадкаванні могілак, рамонце помнікаў і месцаў пахавання воінаў, што загінулі ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

—Кажуць, што гарады і вёскі маюць перспектыву, калі там працягваецца будаўніцтва. Дзяржава ў гэтым дапамагае рэгіёну?

— Для льготных катэгорый грамадзян за кошы сродкаў Дзяржаунай праграмы летась было пабудавана 112 кватэр агульнай плошчай 6,1 тыс. кв. метраў. У мэтах паляпшэння ўмоў пражывання насельніцтваў пацярпелых раёмаж газіфікаваны 2453 жылыя дамы, пракладзены газаправоды агульнан працягласцю 156,7 км, уведзена ў эксплуатацыю 27,9 км водаправодных сетак, 9,9 км дарог і вуліц.

— Для адраджэння пацярпелых раёнаў неабходна штогод выдаткоўваць даволі сур'ёзныя фінансавыя сродкі...

— Летась на гэтыя мэты з рэспубліканскага бюджэту было накіравана каля 2,4 трлн рублёў. На гэты год запланавана фінансаванне дзяржпраграмы ўжо на суму больш за 3,5 трлн рублёў. Гэтыя грошы накіроўваюцца на сацыяльную

абарону і рэабілітацыю насельніцтва, для правядзення эканамічнага развіцця тэрыгорый і засцерагальмых мерапрыемстваў у сельскай гаспадарцы і г.д. Калі параўноўваць урон, які быў нанесены нашай краіне гэтай катастрофай, то ён ацэньваецца навукоўцамі на суму каля 235 млрд долараў. Акрамя таго, за постчарнобыльскі перыяд наша дзяржава ўжо накіравала на ліквідацыю наступстваў ад катастрофы на ЧАЭС каля 20 млрд USD уласных сродкаў.

— Кажуць, што праблемы разам вырашаць лягчэй. Чарнобыльская катастрофа стала агульнай бядой нашай краіны і Расіі...

— Так. Нашымі краінамі была распрацавана канцэпцыя праграмы сумеснай дзейнасці па пераадольванні наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў рамках Саюзнай дзяржавы на перыяд да 2016 года. У бліжэйшы час чакаецца прынясце Саветам Міністраў Саюзнай дзяржавы новай саюзнай праграмы. Планувцца, што на 4-ю чарнобыльскую праграму з бюджэту Саюзнай дзяржавы будзе накіравана 1 млрд 414 млн расійскіх рублёў.

***Сяргей КУРКАЧ***

**Источник**: Звязда. — 2013. — №78 (26 крас.). — С. 1—2.